## Валанцёрская акцыя “Дары радасць на Вялікдзень!”

У рамках акцыі “Дары радасць на Вялікдзень” 21 красавіка валанцёры ДУА “Жупранская сярэдняя школа імя Ф. К.Багушэвіча” сумесна са спецыялістамі ГУК “Аддзел культуры і вольнага часу аг. Жупраны” прыйшлі павіншаваць грамадзян, якія пражываюць у аддзяленні кругласутачнага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту і інвалідаў з Вялікаднем. Валанцёры-школьнікі выканалі велікодныя песні, падарылі пажылым людзям радасць Светлага Хрыстова Уваскасення, а таксама велікодныя яйкі і прысмакі.





